# СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

№ 28 (43), 09 – 15.11. 2006 г.

# «РУССКИЙ МАРШ» І БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

## ГАЛОЎНЫ ЛОЗУНГ БЕЛАРУСАЎ ПА-РАНЕЙШАМУ — “ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА!”

4 лістапада ў Расіі другі год запар афіцыйна адзначаўся як Дзень нацыянальнага адзінства. Другі год запар расійскія нацыянал-фашысты спрабавалі правесці ў Маскве і іншых гарадах “Русский марш» пад адкрыта ксенафобскімі, расісцкімі лозунгамі. Адным з галоўных удзельнікаў маршу быў, напрыклад, “Рух супраць нелегальнай іміграцыі”, які выступае за пагромы і дэпартацыю з краіны ўсіх іншаземцаў. Расійскія ўлады, наполаханыя размахам шавіністых настрояў, якія самі ж падагравалі, гэтым разам “Русский марш” забаранілі.

Здавалася б, якое дачыненне той марш мае да Беларусі? Але ж занадта доўга ўлада прапагандавала лозунгі “славянскае адзінства”, братэрства з Расіяй як адзіным саюзнікам, каб зараз, калі Крэмль пачаў праводзіць адкрыта імперскую палітыку, ад гэтага можна было адмахнуцца.




**Моладзь нясе** *крыжы і транспаранты падчас маршу ў Курапаты. Мінск, 29 кастрычніка 2006 году.*

Чым бы ні скончыліся зараз перамовы ў Маскве паміж кіраўнікамі Беларусі і Расіі, можна не сумнявацца, што Масква па-ранейшаму будзе спрабаваць дыктаваць свае ўмовы Мінску з дапамогай эканамічнага шантажу. Пакуль што ўлады РБ гэтага яшчэ не ўсвядомілі, але прыйшоў момант, калі многае, калі не ўсё, будзе залежаць не ад іх, але ад беларускага народа. У тым ліку – беларускіх дзеячоў культуры, інтэлігенцыі, моладзі…

Наколькі моцна беларусы атручаныя чужой ім ідэалогіяй, пад якімі лозунгамі здольныя выйсці на вуліцу?

**Працяг тэмы – на стар. 2, 4**

## ЗА ШТО ПРЭМ'ЕРА БЕЛАРУСІ СЯРГЕЯ СІДОРСКАГА АДПРАВІЛІ Ў АДПАЧЫНАК?

► СТАР. 5

## «ЦУКЕРКАВАЯ ВАЙНА» З РАСІЯЙ

### АГЛЯД ПРЭСЫ

► СТАР.6

# ЦІ МАГЧЫМЫ Ў БЕЛАРУСІ «РУССКИЙ МАРШ»?

**ЭНІРА БРАНІЦКАЯ, МАЛАДЗЁВЫ ЛІДЭР:**

## "ГЭТА НЕРЭАЛЬНА"

Я лічу, што не. Таму што мы розныя, і менталітэт у нас розны. У нас немагчымыя канфлікты на расавай глебе. Сітуацыі, спрыяльныя для такіх канфліктаў, у Беларусі былі заўсёды, але саміх канфліктаў не было. У маладзёвым асяроддзі я ніколі не адчувала праяваў ксенафобіі. Хоць кантактавала з рознымі маладымі людзьмі. Галоўная рыса нашай моладзі – абсалютная абыякавасць. Яны могуць нешта сказаць, але арганізаваць акцыю, як у Расіі... Нерэальна. Ім утульней пачувацца, калі "ўсё роўна", чымся "за штосці".

**СЯМЁН БУКЧЫН, ПІСЬМЕННІК:**

## "Я НЕ ЗДЗІВІЎСЯ Б"

Я думаю, што пры пэўных захадах улады ён можа быць. Улада можа ўсё выкарыстаць. Яна сёння валодае ўсімі механізмамі, выбарамі, маршамі, усімі магчымасцямі, каб праводзіць свае акцыі. Яна можа правесці канцэрт на плошчы для 50-ці тысяч, і сам прэзідэнт будзе танчыць. А можа правесці марш, калі спатрэбіцца. Усё залежыць ад палітычных намераў. А калі казаць пра грамадскую атмасферу, дык грамадства ў нас не існуе. Усе парасткі яго знішчаныя пасля 1995 году. Могуць быць асобныя рэакцыі, могуць быць купкі незадаволеных людзей. Але гэта не лічыцца. Таму што сур'ёзнага пратэсту ў гэтых умовах не будзе. У гэтых умовах усё магчыма. І я не здзівіўся б «Русскому маршу» на нашых вуліцах.

**УЛАДЗІМІР КРУКОЎСКІ, МАСТАК:**

## «СЁННЯ ТАКАЯ АКЦЫЯ НЕМАГЧЫМАЯ»

А якім чынам ён можа прайсці ў Беларусі? Я не разумею. Ён абсалютна немагчымы. Вы што? Аляксандр Рыгоравіч дазволіць тут такое? Асабліва сёння, калі газ можа падаражаць у тры разы. Нашыя доблесныя амонаўцы ім пакажуць…Турма на Акрэсціна будзе перапоўненая. Там марш і закончыцца. Сітуацыя мяняецца вельмі хутка, літаральна на нашых вачах. Ні сёння, ні заўтра такая акцыя немагчымая. І чым даўжэй жывем, тым менш гэта магчыма. Забудзьцеся пра інтэграцыю, пра Саюз, пра агульную валюту і астатнія бздуры, якой кампаставалі нам мазгі на працягу 15 гадоў. Гэта пройдзены этап. Ніякіх праяваў расійскага імперыялізму ў Беларусі не можа быць. Хай толькі паспрабуюць. Але я не думаю, што ў кагосці хопіць мазгоў нават спрабаваць.

**АЛЯКСАНДР, ІНЖЫНЕР:**

## "У ГОМЕЛІ МОЖА ПРАЙСЦІ ТАКАЯ АКЦЫЯ"

У Гомелі можа прайсці такая акцыя. Бо шараговы гамяльчанін жыве ўсё ж-такі не ў Беларусі. У ягонай галаве, па-ранейшаму, сталіца – Масква. Куды трэба імкнуцца па грошы і па славу. У сваім горадзе ён атачаны расійскай імперскай сімволікай. Князь Паскевіч, які біў «палякаў-здраднікаў». Граф Румянцаў, які з «заштатнага беларускага мястэчка» зрабіў горад са школамі і бальніцамі. І помнік Пушкіну, які тут калісці праязджаў, і помнік Сувораву ў музеі баявой славы вельмі арганічна ўпісваюцца ў гомельскія мазгі. У галовах у многіх, акрамя таго, сядзіць уяўленне пра расійскі стабілізацыйны фонд ў трыльён баксаў. Крута! А тут што? Камбайн «Гомсельмаш»? А Мінск – гэта недзе далёка. Як і «беларускамоўныя шызікі». Пра іх кажуць: «Пісьменнікі за баксы прыехалі з Мінска». Гамяльчане ў рэальнасці адчуваюць вялікі дыскамфорт. І могуць, пры пэўнай арганізацыі, выйсці, каб давесці сваё права на «русскость».

**КАРЫНА, НАСТАЎНІЦА:**

## «У НАС НЯМА ГЛЕБЫ ДЛЯ КСЕНАФОБІІ»

У нас для падобнай акцыі няма прычын. Колькі беларусаў загінула у чачэнскай вайне? Хто з беларусаў пацярпеў ад якой каўказскай мафіі? Дзе ў нас рынкі, якія цалкам кантралююцца дзецьмі Поўдня? Няма глебы для ксенафобіі.

**АЛЯКСАНДР КУЛІНКОВІЧ, ЛІДЭР ГУРТА «НЕЙРА ДЗЮБЕЛЬ»:**

## «ПЕРАШКОДАЎ УЛАДЫ ЧЫНІЦЬ НЕ БУДУЦЬ»

Я думаю, што магчыма. І ніякіх перашкодаў улады чыніць не будуць. Нашыя ўлады здольныя разагнаць Дзяды ці Чарнобыльскі шлях, але «Русский марш» пройдзе пад узмоцненай аховай міліцыі. Наша краіна ўсё болей і болей становіцца губерняй. Такі марш, вядома, не будзе такі шматлікі, як у Расіі, але ён магчымы. Ёсць вельмі шмат людзей, як правіла вельмі пяшчотнага ўзросту, якія вядуцца на любую ідэю — РНЕ ці нешта падобнае. Нармальныя, здаецца, беларусы, якія не аспрэчваюць сваю беларускасць, але якія пры развітанні чамусці выкрыкваюць: "Слава России!". Я такое бачыў. Напэўна, не хапае мазгоў, каб зразумець, што яны робяць.

**ВІТАЛЬ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "УЛАДА ВЫХОЎВАЕ БЕЛАРУСАЎ"

У Мінску гэта немагчыма. Бо нават пры ўсёй калгаснасці і савецкасці нашай улады, яна выхоўвае беларусаў. Хай не зусім нармальных, не зусім еўрапейскіх, але беларусаў. Яны шчыра любяць прэзідэнта, які навёў парадак і дае прыкурыць "адмарозкам" з апазіцыі, што прадаліся за даляры. Яны пэцкаюць фізіяноміі ў чырвона-зялёныя колеры падчас футбольных матчаў і скандуюць "Бе-ла-русь!". Але ўявіць, каб яны з такім самым імпэтам мазаліся ў расійскі трыкалёр, я не магу. Трактар "Беларусь" з іхнай башкі ўжо нічым не выб'еш. Ніякім двухгаловым арлом.

**УЛАДЗІМІР, ТАКСІСТ:**

## «МЫ НЕ ВЕДАЕМ, ХТО МЫ»

У нас такое немагчыма. Бо мы самі не ведаем, хто мы ёсць. Мы рускія? А чорт яго ведае. Мы беларусы? Таксама невядома. Мы – ні рыба ні мяса. Кожны з нас паасобку.

**ЮРЫ ХАШЧАВАЦКІ, КІНАРЭЖЫСЁР:**

## "ЁН У НАС ІДЗЕ ДАЎНО"

"Русский марш" у нас ідзе даўно. Проста ён адбываецца ў іншых формах. У тым выглядзе, як у Расіі, у нас ён немагчымы. Яшчэ і таму, што нічога ў Беларусі не робіцца без дазволу аднаго, усім нам вядомага чалавека. У той момант, як ён захоча, каб быў гэты марш, будзе марш. Але ідэалагічна гэты марш ужо даўно ідзе. Калі ласка, паглядзіце на дзейнасць выдавецтва "Православная инициатива". Ці на дзейнасць праваслаўнай царквы ў гэтым накірунку. Паглядзіце на тое, што адбываецца з пратэстанцкімі цэрквамі. Паглядзіце на тыя свастыкі, якія намаляваныя на іконах у Курапатах.

# БЕЛАРУСКІЯ ДЗЕЦІ НЕ ЗМОГУЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ У ІТАЛЬЯНСКІХ СЕМ’ЯХ

Прынятае рашэнне заблакаваць аздараўляльныя паездкі ў Італію для беларусікх сірот.

Аб гэтым гаворыцца ў афіцыйным лісце дырэктара дэпартамента гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі прэзідэнта РБ Аляксандра Каляды прэзідэнту італьянскай дабрачыннай Асацыяцыі «Cittadini del Mondo». Ліст апублікаваны на сайце www.sardegnabelarus.it

На думку беларускі Ларысы Сазановіч, якая шмат гадоў працуе ў Расійска-Італьянскім псіхалагічным цэнтры, гэта азначае, што магчымасці прыязджаць у італьянскія сем’і будуць пазбаўленыя менавіта тыя дзеці, якім гэта найбольш патрэбна. З 20 000 дзяцей, якія штогод адпачываюць летам у Італіі, больш за 2000 – сіроты. Большасцю з іх ужо шмат гадоў апякуюцца італьянскія сем’і.



**Віка Мароз.** *Фота з архіву*

Міжнародную вядомасць набыла сёлета гісторыя 10-гадовай Вікі Мароз, якую спрабавала ўдачарыць сям’я Джуста і Барначын. Пасля дэпартацыі сіраты ў Беларусь улады перадалі яе на выхаванне ў сям’ю Васілеўскіх у Жодзіне, якая раней усынавіла брата Вікі. Паводле італьянскага журналіста, якому нядаўна ўдалося пагаварыць з дзяўчынкай па тэлефоне (яна гаворыць па-італьянску), Віка ўсё яшчэ спадзяецца вярнуцца ў Італію. 2 лістапада ў эфіры аднаго з італьянскіх тэлеканалаў прагучаў яе голас.

Некаторыя італьянскія газеты паведамілі аб надзвычайным здарэнні, што здарылася днямі з Джуста і Барначын – іх прыватная яхта, на якой яны паплылі ў мора, нечакана перакулілася. Абодвух удалося ўратаваць. Муж і жонка лічаць, што выпадак стаў вынікам чыёйсці злой волі.

**Паводле www.gazetaby.com (газета “Салідарнасць”) і Радыё Свабода**

# ІРЫНЕ КАЗУЛІНАЙ АДМОВІЛІ Ў СУСТРЭЧЫ З МУЖАМ

Віцебскую калонію, дзе трымаюць палітычную галадоўку экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін і экс-дэпутат Сяргей Скрабец, наведала жонка Казуліна Ірына. Жанчына спрабавала высветліць, як пачуваецца яе муж.

Па выніках сённяшняй размовы з начальнікам калоніі Ірына Казуліна кажа, што ён здолее галадаць не менш за 30 дзён. Між тым, жонка палітыка збіраецца тэрмінова перадаць мужу заклікі апазіцыйных палітычных партый прыпыніць галадоўку. Ірына Казуліна спадзяецца, што на Аляксандра Казуліна падзейнічае інфармацыя пра тое, што ягоныя калегі робяць усё магчымае, каб прыцягнуць увагу свету да беларускага пытання.

Больш пэўных звестак пра стан здароўя Аляксандра Казуліна ягоная жонка не атрымала.

Аляксандр Казулін і Сяргей Скрабец галадаюць з 20 кастрычніка. Апазіцыянеры пратэстуюць супраць незаконнага знаходжання пры ўладзе Аляксандра Лукашэнкі і дамагаюцца разгляду беларускага пытання ў ААН.

**Паводле Радыё Свабода**

# МІЛІНКЕВІЧ ПРА ВЫБАРЫ: “НІХТО НЕ БУДЗЕ ЛІЧЫЦЬ ГАЛАСЫ”

У Кіеве прайшла міжрэгіянальная канферэнцыя аб’яднаных дэмакратычных сіл Беларусі. Частка дэлегатаў не змагла патрапіць на яе з-за перашкодаў з боку уладаў РБ. На канферэнцыі абмяркоўвалася стратэгія і тактыка апазіцыі напярэдадні выбараў у мясцовыя саветы.

Паводле лідэра аб’яданых дэмакратычных сіл Аляксандра Мілінкевіча, шанцаў у апазіцыі патрапіць у саветы няма: “У нас ужо даўно няма выбараў. Улада падрыхтавала сваіх кандыдатаў, і ніхто не будзе лічыць галасы”, — сказаў ён.

Акрамя таго, абмяркоўвалася правядзенне Кангрэсу дэмакратычных сіл, прымеркаванага да мясцовых выбараў. На думку Мілінкевіча, яго трэба праводзіць не за мяжой, а ў Беларусі. Пры гэтым ён падкрэсліў, што калі будзе знойдзеная больш годная кандыдатура, ён гатовы саступіць лідэрства.

Перад гэтым лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька заклікаў увогуле адмовіцца ад выбараў на Кангрэсе лідэра аб’яднаных дэмакратычных сіл як неактуальных.

**Паводле БелаПАН**



# 9 ЛІСТАПАДА ДЗЕНЬ БАРАЦЬБЫ З ФАШЫЗМАМ

**У ноч з 9 на 10 лістапада 1938 году па ўсёй Германіі прайшлі габрэйскія пагромы. Былі забітыя каля ста чалавек, спаленыя і разрабаваныя тысячы крамаў, а таксама сінагогі. Дзясяткі тысяч габрэяў былі арыштаваныя і адпраўленыя ў канцэнтрацыйныя лагеры. Гэтая ноч увайшла ў гісторыю пад назвай “крыштальнай” (з-за мноста аскабалкаў разбітых вітрынаў на вуліцах). З яе пачаўся Халакост – масавае знішчэнне нацыстамі габрэяў (Яго ахвярамі сталі 6 000 000 чалавек). Гэтая дата адзначаецца як Міжнародны дзень барацьбы з фашызмам і антысемітызмам, а таксама нацыянальнай сегрэгацыяй. У Мінску гэты дзень пачалі нефармальна адзначаць толькі ў апошнія гады. Сёлета арганізатары заклікалі сабрацца ў памяць аб ахвярах фашызму на мемарыяле “Яма” – месцы, дзе гітлераўцы падчас вайны знішчылі 5000 вязняў мінскага гета. Апошнім часам мемарыял некалькі разоў апаганьваўся.**

# «РУССКИЙ МАРШ» І БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

## ГАЛОЎНЫ ЛОЗУНГ БЕЛАРУСАЎ ПА-РАНЕЙШАМУ — “ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА!”

Пачнем з таго, што “Русский марш” не можа быць арганізаваны ўладай, інакш гэта будзе ўжо зусім іншая з’ява і іншая краіна, накшталт гітлераўскай Германіі. “Русский марш” пачынаецца знізу, улады могуць яго дазволіць або забараніць, падтрымаць або не дапусціць.

Фашысцкія арганізацыі ў аўтарытарных краінах звычайна выкарыстоўваюцца як ланцуговы сабака, які то адпускаецца на большую даўжыню, калі трэба “пакусаць” апанентаў з дэмакратычнай апазіцыі і ўвогуле крыху прыструніць народ, то падцягваецца да нагі, калі трэба зрабіць “дэмакратычны выгляд” на міжнароднай арэне. Як правіла, фашыстаў не трэба ствараць або прыдумляць – яны з’яўляюцца самі і маргінальна існуюць у любой краіне свету. Іх можна падкармліваць, альбо старацца трымаць у больш-менш небяспечнай кандыцыі – як і любую іншую злачыннасць.

**У Беларусі магчымы толькі адзін марш, звязаны з нацыянальным пытаннем, – беларускі. Прынамсі, за апошнія 20 гадоў толькі беларускія маршы – а дакладней, шляхі – хадзілі па нашых праспектах. І тое не з мэтай паказаць сваю перавагу над іншымі...**




Ці ёсць у Беларусі такі грамадскі, сацыяльны, ментальны патэнцыял, які мог бы заўтра выплеснуцца на вуліцы “Русским маршем”? Прынамсі гісторыя ўсяго мінулага стагоддзя паказвае, што ані такога патэнцыялу, ані прэцэдэнтаў такіх маршаў у нас няма.

У Беларусі магчымы толькі адзін марш, звязаны з нацыянальным пытаннем, – беларускі. Прынамсі, за апошнія 20 гадоў толькі беларускія маршы – а дакладней, шляхі – хадзілі па нашых праспектах. І тое не з мэтай паказаць сваю перавагу над іншымі, а толькі каб сцвердзіць, насуперак афіцыйнай русіфікацыі, што беларусы не горшыя за іншых, а значыць, маюць права.

Усе нашы “Чарнобыльскія шляхі” і “Дні Волі”, усе акцыі салідарнасці з палітвязнямі 16 дня кожнага месяца – усё гэта і ёсць адзін беларускі шлях негвалтоўнага самасцвярджэння, насуперак гвалтоўнай антыбеларускай палітыцы рэжыму. Сёння ўся ўласна беларуская літаратура і музыка, уся культура, уся ўласна беларуская моладзь – гэта адзін беларускі шлях.

Чаму за ўсё мінулае стагоддзе мы не маем выразных прэцэдэнтаў “русского марша” ў Беларусі? Магчыма, таму, што такім маршам пасутнасці з’яўляецца палітыка афіцыйнага кіраўніцтва краіны. Але нават калі б кіраўніцтва праводзіла іншую палітыку, “русскому маршу” не было б адкуль узяцца. Адзіная іх крыніца – гэта існаванне ў нас філіялаў маскоўскіх фашысцкіх арганізацый. Але іх уплыў нязначны. Нават не настолькі значны, як у пачатку стагоддзя, калі эмісары з Расіі спрабавалі зладзіць ва ўсходніх гарадах Беларусі габрэйскія пагромы. У адрозненне ад Расіі, такія пагромы не сталі тады ў нас ані тэндэнцыяй, ані з’явай. Зноў жа таму, што не мелі мясцовых каранёў.

У дакументах нямецкай акупацыйнай адміністрацыі часоў мінулай вайны ўтрымліваецца мноства сведчанняў нездатнасці беларусаў да “русского марша”. Вось некалькі характэрных цытат з рапартаў гітлераўскіх афіцэраў:

«Беларусаў нельга спраўакаваць на пагромы жыдоў».

«У Мінску не назіраецца ярка выражанага антысемітызму».

«Інсцэніраваць пагромы супраць жыдоў дагэтуль у звязку з пасіўнасцю... беларусаў аказалася немагчыма».

Гэта, натуральна, не значыць, што ў часе вайны ў Беларусі панаваў мір і спакой. Мясарубка рэпрэсій не спынялася ні на хвіліну. Вось толькі да выканання экзекуцый немцам даводзілася прыцягваць не мясцовых актывістаў, а карнікаў з Украіны і Літвы.

За прамінулыя 60 гадоў беларусы ў плане ксенафобіі не сталі больш актыўнымі. І калі самахоць і выходзяць на вуліцы маршам, дык зусім не таму, каб пратэставаць супраць габрэяў ці асобаў “каўказскай нацыянальнасці”, а ўсё з тым жа сваім старым лозунгам – “Людзьмі звацца!”

**Алесь Кебік**

# ЗА ШТО СІДОРСКІ АДПРАЎЛЕНЫ Ў АДПАЧЫНАК?

## НЕПРАДАДЗЕНЫ ЗАПАС ТАВАРАЎ – ГАЛАЎНЫ БОЛЬ УРАДУ

Сёння ў Беларусі існуюць навіны двух відаў: “для народа” – тыя, што перадае БТ, і сапраўдныя, аб якіх дзяржаўныя СМІ лічаць за лепшае не гаварыць. Навіны “для народа” тычацца поспехаў беларускай эканамічнай мадэлі. Іншыя навіны, пра якія звычайным грамадзянам ведаць нібыта шкодна, тычацца рэальнага стану рэчаў.

Так, на мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка абмяркоўваў з міністрамі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі за першыя восем месяцаў гэтага году і перспектывы на будучы год. Тэлегледачы, зразумела, пачулі бадзёрыя каментары на тэму: “як у нас усё цудоўна!” Пры гэтым “па-за кадрам” застаўся эканамічны аналіз, зроблены, дарэчы, не апазіцыйнымі эканамістамі, а супрацоўнікамі прэзідэнцкай адміністрацыі. І гэты аналіз прымушае ўсумніцца ў поспехах “беларускай эканамічнай мадэлі”.



**Прэм’ер-міністр Беларусі** *Сяргей Сідорскі. Фота з архіву.*

У дакуменце, напрыклад, змешчаная даволі нярадасная статыстыка: «рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі зменшылася за 8 месяцаў з 14,4 да 14,1%. Прыбытку недаатрымана на 170 млрд. рублёў. Стратныя 1692 арганізацыі (15,4% агульнай колькасці). А 60% арганізацыяў, паводле Міністэрства статыстыкі і аналізу, па выніках першага паўгоддзя проста не мелі сваіх абаротных сродкаў».

Калі паспрабаваць абмаляваць стан рэчаў даступнай мовай, то можна сказаць так. У Беларусі ўзраслі аб’ёмы вытворчасці – мы сталі выпускаць больш трактараў, цукерак, абутку і г.д. Але ўся гэтая выробленая прадукцыя нікому не патрэбная. Бо яе не купляюць, і яна ляжыць мёртвым грузам на складах. З пачатку году запасы гатовай прадукцыі павялічыліся на 20,9%. Кошт гэтых запасаў сягае 2,5 трыльёна рублёў.

Калі задумацца – гэта фантастычная сума.

Пры гэтым, усе спробы прадаць хоць частку запасаў поспеху не маюць. У верасні прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі дакладаў Лукашэнку аб сітуацыі ў гэтай сферы. Шматлікія візіты беларускага прэм’ера ў расійскія рэгіёны не дапамаглі вырашыць праблему – разгрузіць да Новага году склады беларускіх прадпрыемстваў ніяк не атрымліваецца.

Паводле інфармацыі з крыніц ва ўрадзе, абурэнне Лукашэнкі было нагэтулькі моцным, што ён на закрытым пасяджэнні лаяўся на міністраў матам. Сідорскі ў сваё апраўданне ківаў на Крэмль – маўляў, гэта там перакрылі расійскі рынак для беларускіх тавараў. Пасля тае нарады беларускі прэм’ер быў адпраўлены ў адпачынак. Афіцыйна – на два тыдні. Але ў кулуарах улады загаварылі аб тым, што ў Беларусі можа хутка з’явіцца новы прэм’ер. Хоць усім ясна, што справа не ў асобе кіраўніка ўраду Сяргея Сідорскага. Справа ў эканамічнай мадэлі, якая сябе не апраўдвае.

Каля 25% беларускіх прадпрыемстваў сёлета знізілі аб’ём вытворчасці. У гандлі з галоўным пакупнікам беларускай прадукцыі – Расіяй – адмоўнае сальда павялічылася за год з 2,43 мільярда даляраў да 4, 24. Фактычна, павялічылася ўдвая. Нягледзячы на рост вытворчасці, няўхільна расце імпарт. Завозіцца адзенне, абутак, кандытарскія вырабы, сыры, крухмал, маргарын, нават марожанае.

Эканамісты адміністрацыі прэзідэнта вымушаныя прызнаць: “не гледзячы на эканамічны рост, сёлета якаснага рыўку у функцыянаванні экономікі не атрымалася”. Уласна кажучы, ніводнага станоўчага факта аўтары даклада аб эканамічнай сітуацыі не згадалі. Нават прэзідэнцкія эканамісты вымушаныя прызнаць, што рэальны стан рэчаў у экономіцы дрэнны. І Беларусі яшчэ вельмі далёка да поспехаў, аб якіх увесь час цвердзяць афіцыйныя СМІ. Толькі кіраўніцтва чамусці ўпэўненае, што беларускім грамадзянам ведаць, як насмарэч ідуць справы ў экономіцы, не трэба.

**Алег Ман**

# СУПРАЦЬ КАРУПЦЫІ БЕЛАРУСЬ – СЯРОД ГОРШЫХ

*У 2006 годзе Беларусь набрала 2,1 бала і апынулася на 151-м месцы. Столькі ж балаў набралі Камбоджа, Кот-Дывуар, Экватарыяльная Гвінея і Узбекістан.*

Гэта вынікае з дакладу міжнароднай арганізацыі Transparency International “Індэкс успрыняцця карупцыі -2006”, апублікаванага ў Лондане.

Індэкс складаецца штогод на падставе меркаванняў экспертаў і прадпрымальнікаў у 163-х краінах свету. У ім адлюстроўваецца не столькі ўзровень карупцыі сам па сабе, колькі ўзровень усведамлення праблемы ў грамадстве, разумення або неразумення важнасці процідзеяння хабарніцтву. Індэкс вызначаецца паводле шкалы ад 0 да 10 балаў, прычым 0 азначае самы высокі ўзровень успрыняцця карупцыі, а 10 – самы нізкі.

Апошні радок сёлета заняла Рэспубліка Гаіці, перадапошні – Ірак. Расія (2,5) апынулася ў ліку краінаў, якія займаюць месцы са 121-га па 129-е. Гэта, у асноўным, афрыканскія краіны, а таксама Гандурас, Непал і Філіпіны.

Украіна (2,8) замыкае першую сотню ў рэйтынгу разам з Грузіяй, Мазамбікам ды Манголіяй.

Польшча (3,7) заняла 61-е месца побач з Ямайкай і Ліванам. Латвія (4,7) разам са Славакіяй дзеляць 49 месца. Прычым, у дакладзе адзначаецца што Латвія апошнім часам дамаглася ў пераадоленні карупцыі значнага прагрэсу. Адзначаецца таксама паляпшэнне сітуацыі ў Чэхіі, якая набрала такі самы бал, што і Літва – 4,8 .

Першае месца (9,3 бала) традыцыйна дзеляць паміж сабой Фінляндыя, Ісландыя і Новая Зеландыя.

У дакладзе ТІ адзначаецца яўная сувязь паміж узроўнем беднасці і карупцыяй. Тры чвэрці ўсіх краінаў набралі меней за 5 балаў і аднначасова маюць вельмі нізкі ўровень даходаў на душу насельніцтва. Разам з тым, нягледзячы на высокі індэкс развітых краінаў Захаду, ва многіх з іх адбываліся гучныя карупцыйныя скандалы. Не пазбеглі іх і суседзі Беларусі ў Еўропе – Латвія, Літва, Польшча. Тым не менш, там разумеюць пагрозу хабарніцтва для грамадства, а ў Беларусі хабар застаецца звыклай з’явай.

**Паводле www.transparency.org**

Саюздрук

# "САЛОДКАЯ ВАЙНА" З РАСІЯЙ

## АЛЬБО СМЕРЦЬ АД "МАКСІМКІ"

Цукеркавы канфлікт паміж Беларуссю і Расіяй набірае абароты. Паводле публікацыі ў **"Народнай газеце"**, баі на кандытарскім фронце прымаюць далёка не лагодны характар.

*"Половина белорусских кондитерских изделий на российском рынке считается контрафактной и не допускается на этот рынок, — отметил председатель концерна "Белгоспищепром" Иван Данченко.*

*И вполне вероятно, что очень скоро белорусские производители сладостей дадут в этом вопросе россиянам отпор — той же монетой. По крайней мере, именно "принять ответные меры к российским конфетам" призвал всех руководителей белорусских кондитерских предприятий глава "Белгоспищепрома"…*

*Фактически это означает поступить так же, как поступили сами россияне: ограничить ввоз в нашу страну кондитерских изделий, в частности российских, тех же названий, что выпускаются и белорусскими кондитерскими предприятиями".*

Цікава, ці да расійскіх кандытараў ужо даляцела гэтая трывожная вестка? Не іначай, абліваюцца слязьмі і падлічваюць убыткі. Такі багаты рэгіён для іх закрыўся. Памятаеце, як Лукашэнка казаў правінцыйным расійскім журналістам, што беларускім калгаснікам няма куды грошы падзець? Цяпер, напэўна, шчаслівым насельнікам аграгарадкоў улады падкажуць, куды патраціць свае мільённыя месячныя заробкі. "Мишек на Севере" з "Алёнками" наядуцца на ўсё астатняе жыццё.

А **"Минский курьер"** змясціў даволі крамольнае інтэрвію з галоўным урачом гарадскога псіханеўралагічнага дыспансера Аляксандрам Старцавым. Некаторыя звесткі, агучаныя доктарам, наводзяць на цікавыя высновы.

*"Статистика утверждает, что количество истинно психических расстройств, таких как шизофрения или эпилепсия, врожденные аномалии развития, стабильно -- один процент от общего числа населения во всех странах. А вот уровень пограничных нервно-психических расстройств, безусловно, в настоящее время растет. Это связано, прежде всего, с особенностями социума, в котором мы живем…*

*С 1994 года самоубийства -- на четвертом месте среди причин смерти. Кстати, наиболее благополучный регион в этом отношении -- Минск. За последние годы здесь отмечается самый низкий уровень суицидального поведения".*

Нешта тут не сыходзіцца. Здаецца, наш галоўны лекар прыкладае ўсе намаганні, каб жыццё нашае амаль не мянялася. А псіхіка расстройваецца ўсё больш і больш. Асабліва ўражвае "суіцыдальны" год 1994-ы, ад якога вядзецца адлік. Проста містыка нейкая. Дзякуй Богу, што самагубствы ў нас пакуль што толькі на чацвертым месцы.

Зрэшты, пачытаўшы **«Вечерний Минск»** у гэтым можна ўсумніцца. Гаворка ідзе пра атручанні расійскім тэхнічным спіртам, якія пагражаюць набыць размах эпідэміі.

*"У нас статистику массовых отравлений суррогатами открыли Ошмяны. Потом, в течение октября, список дополнили Борисов, Жодино, Полоцк, и вот — Смолевичи. Очень близко от столицы...*

*Надо сказать, что почва для этой беды у нас хорошо подготовлена. По данным, которые опубликованы в республиканских государственных СМИ, белорусы употребляют в год 9,7 литра абсолютного алкоголя. Это больше, чем у наших соседей: России (9,1), Латвии (7,9) и Польши (6,5), — и на три литра больше, чем в 1995 году. При этом надо помнить, что официальная статистика не учитывает произведенного и выпитого самогона и тех самых спиртосодержащих алкогольных суррогатов, которые изготавливают кустарным способом из разнообразных технических жидкостей — стеклоочистителей, антиобледенительных составов, часто носящих невинные названия типа "Кирюша" или "Максимка".*

*…на начало 2006 года диагноз "алкоголизм" или "алкогольный психоз" имели в Беларуси более 175 тысяч человек.*

*Выводов судебно-медицинских и химических экспертиз еще нет, но похоже, что сегодня наши алкоголики становятся жертвами именно российских ядовитых ингредиентов".*

Нашаму мінхарчу трэба тэрмінова распрацаваць тэхналогію прыгатавання пладовых вінаў "Максімка" і "Кіруша". Каб мець законныя падставы для забароны ўвозу аднайменных напояў на беларускую тэрыторыю. Калі ж сур'ёзна, дык у Беларусь прыйшла чарговая бяда. У параўнанні з ёй любое "чарніла" мае смак амброзіі. Калі так справа пойдзе далей, мы праз гадоў 20 нашую краіну не пазнаем. Калі, зразумела, не пяройдзем пагалоўна на чай з цукеркамі.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# ЭФЕКТ ПРЫСУТНАСЦІ

## ЯК ЗНЯЦЬ "НАПРУДЖАННЕ"

2 лістапада ў праграме "Поверх барьеров. Европейский час" на рускай "Свабодзе" мы пачулі рэпартаж Аляксея Дзікавіцкага пра беларускі бардаўскі фэст на Беласточчыне. Гучалі галасы арганізатараў, удзельнікаў — і ветэранаў і дэбютантаў, ажно чатыры музычныя ілюстрацыі і featureрознабаковы каментар самага журналіста. Я падумаў, чаму так добра ўдалося Дзікавіцкаму гэта зрабіць? Можа быць таму, што на рэпартаж яму дадзена было дастаткова часу – хвілінаў пяць, калі не больш. Пра гэта варта падумаць усім нашым радыёстанцыям. Магчыма, замест штодзённых кароценькіх рэпартажаў пра адно і тое ж, трэба даваць падрабязныя панарамныя рэпартажы аб якойсці адной падзеі?

Надта спадабаўся рэпартаж Юркі Ляшчынскага на Радыё Палонія 1 лістапада — пра прыватны этнаграфічны музей. Адзін чалавек у сваёй вясковай хаце сабраў старыя рэчы, якімі ў ягонай маладосці людзі карысталіся не як экспанатамі, а як прыладамі працы, парабіў надпісы і водзіць цяпер там экскурсіі. Калі ён паказваў журналісту жорны, чуваць было, як яны скрыгочуць. Калі паказваў ткацкі станок і ўсялякія развітушкі, чуваць было, як яны чахкаюць і круцяцца. Хацелася б, каб часцей радыёрэпартажы былі насычаныя такімі натуральнымі гукавымі ілюстрацыямі.

Моўная заўвага. Часта на розных станцыях ад розных карэспандэнтаў можна пачуць такія словы – ураДжанне, напруДжанне. Кажуць, беларуская мова – самая цяжкая ў свеце. Некаторым надта цяжка вывучыць, што слова "ураджай" – ад урадзіць, а "уражанне" – ад уразіць.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# НЕ ПАГАВАРЫЛІ

## У БЕЛАРУСКІМ АСЯРОДДЗІ ТОЛЬКІ ТРЫ ТЭМЫ ДЛЯ РАЗМОВЫ

Карней Чукоўскі ўспамінаў, як на ягоным лецішчы пры газавай лямпе і самавары збіраліся пісьменнікі, мастакі ды музыкі, — каб пагутарыць, паспрачацца.

Такое чытаеш – і зайздросціш.

Магчыма, гэта адна з прыкметаў энтрапіі, распаду грамадства – мы развучыліся размаўляць.

А яшчэ так нядаўна былі славутыя гутаркі на кухнях – з выпіўкай і без, дапазна, ад душы і пра ўсё на свеце.

Вось у мяне быў сябра са студэнцкіх віцебскіх гадоў. Колькі з ім было перагаворана – пры тым, што я не належу да асабліва гаваркіх.

Так было, пакуль ён не захапіўся праваслаўем. І перастаў – размаўляць. Бо пачаў – прапаведаваць. Мог рабіць гэта гадзінамі, ледзь не ўсю ноч. І гэта ўжо былі толькі маналогі. Ані слова, ані рэплікі ўставіць было немагчыма.

Няма больш крыўдлівых людзей, чым рэлігійна заклапочаныя.

Неяк на пленэры ў Польшчы адна мясцовая мастачка доўга апавядала, якім ударам для яе была смерць Яна Паўла ІІ. А я так неасцярожна спытаў – “А вы што, хацелі б, каб ён далей мучыўся?”, маючы на ўвазе, якімі пакутлівымі былі апошнія гады жыцця пантыфіка.

Скончылася скандалам, слязамі, маімі перапросінамі на другі дзень, — але больш мяне ў гэтую кампанію не запрашаюць.

А здавалася б, — чым не тэма для размовы: што ёсць адыход асобы, якая выканала сваю місію? Трагедыяй ці сумнай непазбежнасцю?

У той жа Польшчы мне пашчасціла некалькі разоў размаўляць з вядомым рэжысёрам Кшыштафам Занусі. Вось з кім гутарка – радасць. Асоба, якая мае што сказаць і здольная цікавіцца й тваімі думкамі.

Толькі вось дзе ж у нас такіх “занусяў” набрацца?

Зараджаюцца, растуць і распадаюцца імперыі; узнікаюць і змагаюцца міжсобку літаратурныя і мастацкія плыні; мяняюцца светапогляды і моды; па небе і старонках друку лётаюць НЛА... – а ў беларускім асяроддзі толькі тры тэмы для размовы: 1) Лукашэнка, 2) абгаворы знаёмых (не з лепшага боку), 3) наша беднасць і нястача.

Любыя спробы вывесці дыскусію за гэтыя рамкі сканчаюцца тым, што павісае няёмкая паўза. Затым хтось пачынае прыслухоўвацца да ўнутранага “таймера” і ўспамінае, што мае шмат працы, і ўвогуле заўтра рана ўставаць, — і ўсе разыходзяцца.

І ўжо не хочацца сустракацца.

А цікава, аб чым размаўляе новае sms- і інтэрнэт-пакаленне?

Часам да нас забягае (калі ёсць неадкладная справа) прадстаўнік гэтага племені. Пакутліва спрабуе згарбузаваць сказ пры дапамозе слоў “ціпа” і “кароча”...

Якія ўжо тут дыскусіі пры самавары?..

Назаўсёды адышлі ў мінулае філасофскія дыскусіі “ціпа” платонаўскіх.

Мы ўмеем толькі спяшацца, мітусіцца, штурхацца, цярэшчыць вочы перад маніторам або тэлевізарам – паасобку, у сваіх норках. А жыццё робіцца ўсё “кароча” і “кароча”.

І будзе, як сказаў паэт:

Прайшло жыццё, як не было,

Не пагаварылі...

**Алег Аблажэй**

## ФОТАФАКТ




**«Назад у СССР».** *Так называлася святочная канцэртная праграма, якая дэманстравалася па БТ у гонар дзяржаўнага свята Кастрычніцкай рэвалюцыі. Раніцай таго ж дня камуністы адзначылі 89-ю гадавіну сацыялістычнай рэвалюцыі ўскладаннем кветак да помніка Леніну.(Масавыя дэманстрацыі ў гэты дзень улады праводзіць не дазваляюць). Мінск, плошча Незалежнасці, 7 лістапада 2006 году.*

## Невядомая Беларусь

**9 лістапада** 1941 году нацысты расстралялі паўтары тысячы габрэяў у мястэчку Мір. Астатніх 850 сагналі ў гета, што было ўчыненае на тэрыторыі Мірскага замка – цяпер вядомага помніка архітэктуры, у якім ладзяцца канцэрты поп-зорак.

**10 лістапада** 1920 году армія генерала Булак-Балаховіча ўвайшла ў Мазыр. Тут Станіслаў Булак-Балаховіч абвясціў сябе начальнікам Беларускай Дзяржавы. Пачалося стварэнне органаў самакіравання, былі выпушчаныя паштовыя маркі. Тым часам бальшавікі перакідалі на Палессе свае войскі з Крыму. Пад іхнім наступам 20 лістапада Булак-Балаховіч будзе вымушаны пакінуць Мазыр.

**11 лістапада** 1821 году нарадзіўся расійскі пісьменнік беларускага паходжання Фёдар Дастаеўскі. “Продкі мае выйшлі з літоўскіх балот”, — пісаў аўтар “Братоў Карамазавых”, маючы на ўвазе гняздо свайго роду ў мястэчку Дастоева на Піншчыне.

**12 лістапада** 1933 году ў Германіі на рэферэндуме 95% насельніцтва краіны ўхвалілі палітыку Адольфа Гітлера.

**13 лістапада** 1915 году ў Вільні адкрылася першая беларуская пачатковая школа. Неўзабаве такіх школак будуць адкрытыя дзясяткі, а праз чатыры гады пачне працу славутая Віленская беларуская гімназія.

**15 лістапада** 1907 году памёр Юзаф Каліноўскі. Ён нарадзіўся ў Вільні, скончыў ваенна-інжынерную акадэмію ў Пецярбургу і далучыўся да паўстання 1863 году, быў блізкім паплечнікам Кастуся Каліноўскага. Напрыканцы паўстання Юзафа арыштавалі і адправілі на катаргу ў Іркуцкую губерню. Пасля гэтага ён апынуўся ў Аўстрыі, стаў манахам-кармелітам. А ў 1990-я гады яго кананізавалі, гэта значыць, далучылі да ліку святых.

# СКАЖЫ МНЕ, ХТО ТВОЙ СЯБРА…

## АБ ЧЫМ ПРАМАЎЧАЛІ ЛУКАШЭНКА І АХМАДЗІНІЖАД

Знешняя палітыка Беларусі, як кажуць у Міністэрстве замежных спраў РБ, – “шматвектарная”. Пасля таго, як Беларусь сёлета ўзяла ўдзел у канферэнцыі Руху недалучаных краінаў, дзе тон задаюць Фідэль Кастра з Уга Чавесам, стала ясна, што разнастайныя “вектары” афіцыйнага Мінска скіраваныя ў строга пэўным кірунку — у “трэці свет”.

Іран – магутная рэгіянальная дзяржава на Блізкім Усходзе. Але што можа прынесці Беларусі саюз з дзяржавай, якой пагражаюць санкцыі ААН у сувязі з нежаданнем Тэгерана дапусціць міжнародны кантроль за сваёй ядзернай праграмай, не зусім ясна. Можа быць, разлік робіцца на іранскі газ, які дапаможа Мінску саслабіць дыктат расійскага “Газпрома” на Беларусь? Але наўрад ці іранскі газ абыйдзецца танней за расійскі. Ці надзея на іранскія аўтамабілі “Саманд”, выпуск якіх хутка пачнецца пад Мінскам?

А можа быць, Лукашэнка хоча пераняць іранскі вопыт у стварэнні ўласных ядзерных тэхналогіяў – і не толькі ў пабудове АЭС? Хоць прэзідэнт Ірана Ахмадзініжад (дарэчы, азербайджанец па нацыянальнасці) і кажа, што ўзбагачоны ўран будзе выкарыстоўвацца яго краінай выключна ў мірных мэтах, ён не забывае пры нагодзе паўтараць, што дзяржава Ізраіль не мае права на існаванне. Як, дарэчы, і ЗША. Так бы мовіць, Карфаген павінен быць зруйнаваны.

Такім чынам, паміж кіраўнікамі Беларусі і дзяржавы ў наяўнасці супадзенне поглядаў па многіх пытаннях. У тым ліку, адносна заходняй дэмакратыі.



**Аляксандр Лукашэнка** *сустракаецца з Махмудам Ахмадзініжадам. Паводле некаторых СМІ, у падарунак кіраўнік Беларусі прывез свайму іранскаму калегу… пальму.*

*Тэгеран, 6 лістапада 2006 году.*

Але нябачна спадарожнічаў візіту Лукашэнкі адзін казытлівы момант. Акурат у тыя дні ў суседнім Іраку быў вынесены смяротны прысуд экс-дыктатару Садаму Хусейну. Аляксандр Лукашэнка, як вядома, не аднойчы адкрыта выступаў у яго падтрымку, як барацьбіта з амерыканскім імперыялізмам. Толькі вось у Іране, дзе большасць складаюць мусульмане-шыіты, Садама Хусейна, рэжым якога шыіцкую меншасць у Іраку цкаваў, люта ненавідзяць. (Між іншым, варта нагадаць, што пры Хусейне ў ірана-ірацкай вайне на пачатку 1990-х гадоў загінулі амаль паўмільёна чалавек з абодвух бакоў.) Так што ў Іране супраць павешання Хусейна ніхто, ў прынцыпе, не супраць.

Зразумела, падчас візіта Лукашэнкі ў Тэгеран гэтую далікатную тэму абодва бакі абыйшлі. Як і дзяржаўныя СМІ Беларусі, зразумела. Але ж, як цяжка весці “шматвектарную палітыку”! Не заблытацца б аднойчы ў гэтых самых вектарах.

**М. Турсун-Задэ**

МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ

**VILNIA.COM**

ТУТ, У РАЗДЗЕЛЕ *“АРХІЎ”* ВЫ МОЖАЦЕ ТАКСАМА ЗНАЙСЦІ АПОШНІЯ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ Ў ФАРМАЦЕ PDF;

ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ

**“СВАБОДА” БУДЗЕ ЗА НАМІ!**

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў